*Лексіка. Фразеалогія (5 клас)*

*1. Запішыце паняцці, лексічнае значэнне якіх прыведзена ніжэй:* 1) Слова і яго лексічнае значэнне вывучае ______________________; 2) Тое, што абазначае слова, – гэта яго ________________________; 3) Словы, якія маюць некалькі лексічных значэнняў – гэта __________________________, адно лексічнае значэнне – гэта ______________________________; 4) Словы, якія пішуцца аднолькава, вымаўляюцца аднолькава, але маюць рознае лексічнае значэнне ________________________; 5) Словы з супрацьлеглым значэннем ______________________; 6) Словы, якія пішуцца і вымаўляюцца па-рознаму, але маюць адно лексічнае значэнне ______________________; 7) Словы, якія ўжываюцца толькі ў мове жыхароў пэўнай мясцовасці ______________________; 8) Словы, якія аднолькава разумеюць усе ________________________; 9) Асноўнае лексічнае значэнне слова _________________ __________________; 10) Лексічнае значэнне, якое ўзнікае пры пераносе ўласцівасцей з аднаго прадмета на другі ____________________________________________________

*2. Адгадайце словы па значэнні:* 1) Зашклёная шафа або акно для паказу розных прадметаў, тавараў ____________________; 2) Вялікая гара снегу, намеценая ветрам ___________________; 3) Натуральны выхад падземных вод на паверхню зямлі _____________________; 4) След на скуры ад раны _________; 5) Невялікі марскі заліў, прыдатны для стаянкі суднаў _____________________; 6) Сплеценыя ў кружок лісты, кветкі, якія ўскладаюць на галаву __________________; 7) Магутнае судна, прыстасаванае для плавання і пракладвання дарогі іншым суднам у льдах _________________________; 8) Упрыгожанне, якое прымацоўваецца да мочкі вуха _________________________; 9) Прыемны пах кветак ___________; 10) Кніга або сшытак для фотакартак, малюнкаў, вершаў ______________________

*3. Адзначце словазлучэнні з пераносным значэннем слова:* 1) святло сонца; 2) жалезная воля; 3) залаты гадзіннік; 4) кіпучая дзейнасць; 5) высокія думкі; 6) мяккі характар; 7) драўляны стол; 8) жывая думка; 9) жалудовая шкарлупіна; 10) ружовая хустачка.

*4. Запішыце, да якой групы адносяцца словы: а) агульнаўжывальныя; б) устарэлыя; в) запазычаныя; г) прафесійныя; д) навуковыя тэрміны; е) неалагізмы; ё) дыялектызмы:* 1) чало __; 2) дзень __; 3) укол __; 4) антракт __; 5) аквамабіл __; 6) суфікс __; 7) канаплюк __; 8) космас __; 9) дэлегат __; 10) бацян __

*5. Закрэсліце “трэці лішні”:* 1) увечары – уночы – удзень; 2) бялее – іскрыцца – чарнее; 3) смачны – салодкі – кіслы; 4) халодны – зімовы – цёплы; 5) чужы – родны – блізкі; 6) радасць – сляза – смутак; 7) ранні – позні – сённяшні; 8) пахмурны – вільготны – ясны; 9) абараняць – слабець – мацнець; 10) адарваць – закрыць – адкрыць.

*6. Падкрэсліце слова, якое ў сінанімічным радзе павінна быць першым:* 1) недруг, праціўнік, вораг, непрыяцель; 2) разлад, распад, развал; 3) адважны, смелы, бясстрашны; 4) даўні, старажытны, незапамятны; 5) агромністы, гіганцкі, вялікі; 6) слава, папулярнасць, вядомасць; 7) сцюдзёны, марозны, халодны, ледзяны; 8) страва, харч, яда; 9) дужы, магутны, трывалы; 10) абмотваць, абкручваць, абвіваць

*7. Вызначце від слоў у парах па значэнні: а) антонімы; б) амонімы; в) мнагазначныя словы; г) сінонімы:* 1) многа – безліч __; 2) вольны – заняты __; 3) канчаецца люты – вецер люты __; 4) тры яблыкі – тры мацней __; 5) горкі – салодкі __; 6) арыфметычная задача – першапачатковая задача __; 7) гаварыць – балбатаць __; 8) крыло птушкі – крыло самалёта __; 9) абрывісты – круты __; 10) шырокі гасцінец – бацькаў гасцінец __

*8. Да запазычаных слоў падбярыце беларускія адпаведнікі:* 1) аварыя - ______________; 2) акупант - ______________________; 3) лозунг - ________________________; 4) гарантыя - ______________; 5) эпізод - _______________________; 6) антракт - ________________; 7) бар’ер - _______________; 8) кантраст - ______________________; 9) вердыкт - ________________; 10) аналогія - _____________

*9. Падбярыце да слоў фразеалагізмы:*

1) перашкаджаць - ____________________________________________________;
2) аднолькавыя - _____________________________________________________;
3) пакрыўдзіцца - _____________ ____________________________________;

4) дружна - ______________________________________________________________________;
5) умешвацца - __________________________________________________________________;
6) сваволіць - ___________________________________________________________________;
7) ашукваць - ___________________________________________________________________;
8) вельмі малы - ________________________________________________________________;
9) пустасловіць - _______________________________________________________________;
10) вельмі далёка - ______________________________________________________________

*10. Растлумачце сэнс фразеалагізмаў:*
1) дайсці да пугі - _______________________________________________________________;
2) разводзіць рукамі - ____________________________________________________________;
3) пусціць у ход - ________________________________________________________________;
4) збіцца з панталыку - ___________________________________________________________;
5) у свіныя галасы - ______________________________________________________________;
6) як пшаніцу прадаўшы - _________________________________________________________;
7) паставіць на калені - ___________________________________________________________;
8) бярозаю ліцца - ________________________________________________________________;
9) акунёў лавіць - ________________________________________________________________;
10) непачаты край - ______________________________________________________________